УДК 392

# ВЯСЕЛЬНЫ КАРАВАЙ – СІМВАЛ ЯДНАННЯ І ПРАЦЯГУ РОДУ: ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ АБРАДАВЫХ ДЗЕЯННЯЎ І ІХ ЗНАЧЭННЕ

**Кроцікава М. В.**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава
(г. Віцебск, Беларусь)

Анатацыя. Выключным феноменам традыцыйнага беларускага вяселля з’яўляецца каравай. Згодна з этнаграфічнымі крыніцамі XIX ст., падрыхтоўка і выпяканне гэтага абрадавага хлеба суправаджаліся шматлікімі спецыфічнымі рытуальнымі дзеяннямі, дадаткам да якіх з’яўляліся прадпісанні, забароны, песні, магічныя замовы, якія зліліся ў вельмі складаны і цікавы каравайны абрад. Праведзены структурна-семантычны аналіз вясельнага абраду сведчыць пра тое, што падрыхтоўка каравая была прататыпам рытуальных дзеянняў, у цэнтры якіх аказваліся маладыя.

Ключавыя словы: беларуская культура, сямейная абраднасць, традыцыі, звычаі, каравай.

Summary. The exclusive phenomenon of the traditional Belarusian wedding is the loaf. According to nineteenth-century ethnographic sources, the preparation and baking of this ceremonial bread was accompanied by numerous specific ritual actions, prescriptions, prohibitions, songs, magic spells, which merged into a very complex and interesting roundabout rite. The structural-semantic analysis of the wedding ceremony suggests that the preparation of the loaf was a prototype or model-algorithm of ritual actions, in the center of which the newlyweds turned out to be.

Keywords: belarusian culture, family ritual, traditions, customs, loaf.

У народнай культуры славян хлеб заўсёды выступаў сімвалам годнага жыцця, а значыць, сімвалам шчасця і дабрабыту, што ў абавязковым парадку раілі маладой сям’і. Спрадвеку ў беларусаў жыта сімвалізавала неўміручасць. Стаўленне чалавека да хлеба, якое фарміравалася на працягу шматлікіх стагоддзяў, прывяло да таго, што падрыхтоўка рытуальнага хлеба-каравая стала фактычна пунктам адліку пачатку вяселля, а яго дзяленне – сімвалічным знакам яго завяршэння [5, с. 301].

Трэба адзначыць, што з цягам часу на тэрыторыі Беларусі каравайны абрад аформіўся ў самастойны і складаны рытуальна-абрадавы комплекс, у структуры якога фалькларысты і этнографы выдзяляюць да 12–15 элементаў, якія разгортваюцца паслядоўна. Цікавы факт, што ўжо ў дакументах XIV ст. згадваюцца такія вясельныя чыны, як каравайнікі. Разглядаючы далей адзначанае пытанне, неабходна звярнуць увагу на тое, што ў XIX–XX стст. для гатавання рытуальнага хлеба часцей за ўсё запрашалі замужніх жанчын. Рэдка да гэтай працы запрашалі мужчын або незамужніх дзяўчат [4, с. 432]. Звесткі пра каравайны абрад дайшлі да нас з далёкіх часоў. Так, першае пісьмовае сведчанне пра вясельныя караваі датуецца 1526 г.: “З нагоды... шлюбу князя Васіля Іванавіча з Аленай Глінскай... былі прыгатаваны два вялікія караваі” [5, с. 308]. Такім чынам, вясельны каравайны абрад быў падтрыманы на самым версе беларускага грамадства, што сведчыць пра яго значэнне.

Каб зразумець, які сэнс укладваўся ў гэта радавое святадзейства, неабходна мець на ўвазе ўсё той самы традыцыйны прынцып народнай культуры: “падобнае выклікае падобнае”. Менавіта таму да кожнага новага этапу падрыхтоўкі і выпякання каравая ставіліся з належнай адказнасцю. Падрыхтоўка любой рытуальнай ежы (у дадзеным выпадку – каравая) расцэньвалася нашымі продкамі як абрадавае калектыўна-радавое дзейства. А таму выпадковых людзей у сакральнай прасторы яго падрыхтоўкі не павіннабыць ні ў якім разе. Кола ўдзельнікаў у цэлым было даволі шырокім, але ў кожным канкрэтным рэгіёне абмяжоўвалася прадпісаннямі вельмі строгай мясцовай традыцыі.

Часцей за ўсё ў падрыхтоўцы вясельнага каравая прымалі ўдзел ад трох да сямі найбольш блізкіх у роднасным дачыненні жанчын-каравайніц [6, с. 241]. Асаблівая ўвага звярталася на тое, што да ўдзелу ў выкананні рытуала забаранялася запрашаць жанчын, якія аўдавелі або не мелі дзяцей, а таксама да іх далучалі тых, чый шлюб па розных прычынах апынуўся няўдалым [3, с. 22]. Лічылася, што іх нешчаслівы лёс можа аказаць негатыўны ўплыў на будучыню маладых.

Напрыклад, на Магілёўшчыне абавязковым атрыбутам вяселля быў каравай, які выпякалі напярэдадні. У дзень выпрабу каравая асаблівая ўвага надавалася назіранням за надвор’ем, пра што сведчаць словы мясцовых старажылаў в. Гарадзец Шклоўскага раёна: “Калі ў вясельны дзень, як пякуць каравай, не будзе свяціць сонца, то і жыццё мужа і жонкі будзе нярадасным, а калі ясна засвеціць, то лёс маладых чакаеецца ясны і гарачы”.

Разглядаючы гэты важны перадвясельны абрад, трэба адзначыць, што падрыхтоўка каравая ажыццяўлялася як у хаце маладой, так і ў хаце жаніха. Пяклі напярэдадні вяселля, у дзень вяселля і нават (што рэдка) пасля вяселля, на другі дзень.Здаралася і так, што ў жаніха пяклі каравай напярэдадні вяселля, а ў будучай жонкі – у самы дзень вяселля [2, с. 14]. Каравай рыхтавалі толькі дзяўчыне. “Удава, выходзячы замуж, не магла мець гэтага гонару”, – піша П. Ф. Сумцоў [5, с. 318].

Абавязковай ўмовай сакральнага працэсу стварэння каравая было песеннае суправаджэнне. Асноўныя моманты дзейства і паводзіны ўдзельнікаў каравайнага абраду акрэсліла адна з мясцовых жыхарак в. Гарадзец, Г. Т. Букетава: “Збіраліся ў доме нявесты звычайна пасля абеду перад вяселлем, запрашалі самых актыўных і гаспадарлівых жанчын. Звычайна гэта была хросная нявесты, а таксама жанчына, у якой было шчаслівае жыццё і многа дзяцей. Лічылі, што яна будзе і маладой садзейнічаць, калі будзе прымаць удзел у выпяканні каравая. З кепскім лёсам не звалі ў каравайніцы – калі дзеці або муж памёр”.

Цікава апісвае моманты падрыхтоўкі каравайнага абраду М. М. Шалаева з в. Гарадзец. Яна акцэнтуе ўвагу на дробязях, якія мелі вялікае значэнне пры падрыхтоўцы: “Адказна рыхтаваліся, прыбіралі ў хаце, печку рыхтавалі, стары попел вымяталі голенем, комін чысцілі – бралі елку маленькую з лесу, на палку прывязвалі, каб усюды сажу пачысціць. Гэта трэба было зрабіць абавязкова і перад Пасхай, перад тым як булкі выпякаць”. Вялікая ўвага падчас рытуалу надавалася нават дробязям: “Сачылі, каб дровы не былі сырыя, каб моцна не трашчалі і не стралялі галавешкамі”.

Падчас выпякання каравая жанчыны прытрымліваліся вялікай колькасці забаронаў, каб не нашкодзіць маладым. Напрыклад, цеста стараліся вымешваць далонню, а не кулаком, каб “жаніх не падымаў на нявесту руку” [1, с. 463]. Са слоў апытваных, значную ролю мелі прадукты, набытыя для вясельнага бохана: “Для цеста бралі ўсё самае лепшае: калі масла – то тлустае, яйкі – самыя вялікія, муку – самую добрую, каб жыццё ў маладых было лепшым. Забараняўся гучна размаўляць, лаяцца, а то і цеста магло не падысці, і каравай мог не атрымацца. Забаранялася займацца гаспадарчымі справамі: грукаць, мыць. Уся ўвага павінна быць засяроджагна на караваі”. А вось мясцовая жыхарка в. Гарадзец А. І. Пабядзінская ўспамінае такі важны момант прыгатавання рытуальнага хлеба: “Цеста для каравая павінна быць густым, мукі даволі, каб маладым цэлае жыццё ўсюды поўна і густа было”.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Далейшы ход каравайнага абраду апісвае А. А. Кроцікава: "Як цеста было гатова, то бралі форму і запаўнялі цестам. Стараліся прыгожа аздобіць, кветачкі выразалі. Абавязкова рабілі касу, што толькі прыдумаць маглі, а потым мазалі яйкам зверху, каб ён блішчэў і не падгараў, і ставілі ў печ на лапаце або вілачнікам памагалі, калі лапаты не было. Увесь час, што каравай гатаваўся ў печы, стараліся думаць пра добрае, спяваць песні, расказвалі нейкія гумарэскі, самае галоўнае – не сумаваць". Асаблівая ўвага надавалася таму моманту, калі каравай трэба было вымаць з печы: "Радаваліся, калі каравай добра падышоў, падняўся, гэта быў добры знак, значыць, і жыццё маладых будзе багатым і пышным, як хлеб", – успамінае А. А. Кроцікава. Некаторыя прыкметы, звязаныя з караваем, узгадала Г. Т. Букетава: "Калі каравай трэсне, то жыццё будучых мужа і жонкі "расколецца".

У выніку каравай быў адным з самых важных удзельнікаў вясельнага абраду, які аб'ядноўваў маладых, сям' ю, продкаў, род. Усе, хто ўдзельнічаў у гэтым тварэнні будучага сямейнага шчасця, адначасова адчувалі і стомленасць (працэс выпякання доўжыўся не адну гадзіну), і гонар за тварэнне сваіх рук і свайго духу.

Такім чынам, урачыстасць, асаблівая святочнасць абраду выпякання каравая невыпадковыя ў паўночным рэгіёне Магілёўскай вобласці. Па матэрыялах даследаванняў в. Гарадзец ёсць добрая магчымасць зрабіць высновы, што каравай, з'яўляючыся сімвалам шчасця і дабрабыту, меў вялікае значэнне ў перадвясельны перыяд, а таму было вельмі важным вызначыць кола ўдзельнікаў абраду. Рытуал прыгатавання каравая – своеасаблівы парог, пераступіўшы праз які ўжо нельга было вярнуцца назад. Калі да моманту прыгатавання рытуальнага бохану веселле магло не адбыцца (з улікам пэўных абставін), то менавіта прыгатаванне вясельнага хлеба – гэта зыходны пункт, калі ніякія абставіны не парушаць напрамак абранага лёсу.

**Літаратура:**


1. Белорусы. – Минск: Наука, 1998. – 503 с.
2. Весялуха, М. "Прывезлі нявесту, як сонца…": Беларускае веселле: традыцыі і забабоны / М. Весялуха // Звязда. – 2016. – 14 кастрычніка. – С. 5.
3. Вяселле: абрад / уклад., уступ. артыкул і камент. К. А. Цвіркі; муз. дадатак З. Я. Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
4. Гура, А. В. Каравай / А. В. Гура // Славянские древности: словарь: в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. – Москва: Международные отношения, 1999. – 704 с.
5. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 1.: Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 797 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова